Аддзел адукацыі Шчучынскага раёна
Першамайскі дзіцячы сад – сярэдняя школа

# МАТУЛІН РУЧНІК - У СВЕТ ДАРОГА

**Урок этнаграфіі**

Ёсць у хаце рэчы, якімі карыстаюцца не час ад часу, а пастаянна. Я прапаную вам загадку, якая падкажа, без чаго не абысціся ў хаце:

Як белакрылы птах,
Трапечацца ў руках,
Маркоціцца тады,
Калі няма вады.

Так, гэта РУЧНІК. Што мы ведаем пра яго?

На Беларусі шмат звычаяў, звязаных з выкарыстаннем ручнікоў. Па-ранейшаму ручнік абавязкова прысутнічае ў найбольш важныя, пераломныя этапы жыццёвага шляху чалавека. Мы бачым падоўжаны кавалак ўзорыстай тканіны там, дзе святкуюцца радзіны і вяселле, сустракаем яго і на праводзінах у апошнюю дарогу.

**I.** З якога часу бярэ пачатак гісторыя ручніка, дакладна невядома. Але ў рукі вучоных патрапіў грашовы скарб, абгорнуты у ручнік і закапаны пад час татарскай навалы ў 13 ст. Сатлелыя рэшткі ручніка, захавацца якім дапамаглі сярэбраныя манеты, даюць уяўленні аб выглядзе тагачаснага ручніка, які ужо быў аздоблены ўзорам.

16-17 ст. пакінулі занатоўкі аб ручніках у судовых дакументах. Гэта былі вопісы прыданага жонак баяр і вяльмож.

Партрэт Ф. Скарыны, змешчаны ў яго Бібліі 1517-1519 г., дзе вядомы мысліцель паказаны за маленькім рабочым столікам, пакрытым багата арнаментаваным ручніком. Наяўнасць ручніка, ды яшчэ ў цэнтральнай частцы гравюры – даніна культурным помнікам родгага краю.

На іконах 17-18 ст. нярэдка сустракаецца выява ручніка. Прыкладам служыць “Нараджэнне Маці Божай”.

А 19 ст. ужо прадстаўлена адзінкавымі экземплярамі беларускіх ручнікоў.

Канец 19 – пачатак 20 ст. немагчыма ўявіць без ручніка. Ён уваходзіў у лік прадметаў, без якіх не абыходзілася ніводная сялянская сям’я незалежна ад матэрыяльнага дабрабыту.

**II.** Ручнікі ўмоўна можна падзяліць на 2 групы ў залежнасці ад прызначэння:

дэкаратыўна-абрадавая і гігіенічна-бытавая.

Вам прапануецца спіс назваў ручнікоў, а вы паспрабуйце вызнацыць сферу іх ўжывання. (спіс – на дошцы, прапануем свой варыянт або выбіраем патрэбны)
Уціральнік – выціранне рук і твару пасля ўмывання. Прычым на патрэбу сям’і выдзяляўся толькі 1 ручнік. А вось у лазні абыходзіліся наогул без ручніка.

Скарач – маленькі ручнік, абавязкова з доўгімі махрамі, часам яшчэ і са шнурамі-кутасамі, які выкарыстоўвалі як торбу для пераносу керамічнага посуду з ежай. Маглі выкарыстоўвацца для выцірання рук пасля чорнай працы, так і для выцірrання посуду, а таксама імі “на скорую руку білі дзяцей”.
Дзежнік - палатняная накрыўка для дзяжы.

Абыдзеннік – спецыяльна тканыя для выканання пэўных абрадаў, звязаных з пэўнымі крызіснымі сітуацыямі – эпідэміямі, засухамі, вайной і інш.

Набожнік – для ўпрыгожання абразоў і бажніцаў. Больш сціплыя – для штодзённага побыту, з чорным узорaчам – у час Вялікага посту, з перавагай чырвонага колеру – для святаў.

Ручнік-накручнік для красы – намітка або скіндачка – жаночыя і дзявочыя галаўныя ўборы.

**III.** А цяпер з дапамогай малюнкаў і ручнікоў з выставы паспрабуем назваць ручнікі адносна іх ужывання.

**IV.** Прапаную звернуцца да ручніка як да вернага спадарожніка па жыцці.
І пачнем з радзін.

На сённяшні дзень – тагачасныя радзіны – таемны абрад. Менавіта ручнік надае столькі таемнасці. Паспрабуем разгадаць гэту загадку з дапамогай класцера.

У цэнтры – ручнік. Растлумачце яго сувязь з удзельнікамі хрэсьбін.




Каментарыі:
- На ручніку нашы продкі калісьці прымалі навароджанае дзіця.

◦ Ручнік жанкі з радні, суседкі і знаёмыя прыносілі ў якасці дара маці нованароджанага, прыносілі і што-небудзь з яды, абавязкова хлеб ці пірог і што-небудзь з адзення.

◦ Маці ў сваю чаргу павінна была адарыць ручнікамі бабаку-павітуху, хросных бацькоў, і святара, які хрысціў дзіця.

◦ Быў пашыраны абрад ачышчэння ўсіх прысутных на радзінах, які, як лічылася, мусіў станоўча паўплываць на іх здароўе і дабрабыт. У ваду, у якой купалі малое пасля хрышчэння, насыпалі авёс і, змачыўшы ў ёй уціральнік, бабка кожнаму з прысутных выцірала твар, а авёс раскідвалі па ўсёй хаце.

◦ Перш чым вымавіць пажаданні навароджанаму, бабка-павітуха накрывалася ручніком. Гаршок з “бабінай кашай” таксама ставіўся на стол, абгорнуты ручніком .

**V.** II важны этап у жыцці – <u>вяселле</u>. Раскрыць функцыю ручніка ў этапах гэтай значнай падзеі нам дапаможа віктарына. Не забывайце, што ва ўсіх вашых адказах галоўная роля належыць ручніку.

1. Якая рэч абавязкова павінна была прысутнічаць у пасагу нявесты? (ручнік)

2. Колькі ручнікоў павінна было ўваходзіць у пасаг? (5,6,10,12,40)

3. Якая рэч сімвалізавала згоду на шлюб пад час сватаўства? Якім чынам? (ручнік, якім абвязвалі бутэльку з гарэлкай, у якую маці насыпала жыта)

4. Чым, а дакладней адсутнасцю якой рэчы маглі вытлумачыць бацькі нявесты адмову сватам? (недахопам ручнікоў)

5. Колькі ручнікоў і як выкарыстоўвала нявеста пры запросінах на вяселле? Адказаць на пытанне вам дапамогуць словы: хлеб, рука, дзверы, сцежка. (3 ручнікі; I – з хлебам; II – завязаны на руку; III – цягнула па сцежцы, не закрываючы дзвярэй, каб дочкі гаспадара хутчэй выйшлі замуж)

6. Як выкарыстоўваўся ручнік у абрадзе пасада маладых (па-асобку)? (садзілі на дзяжу, пакрытую ручніком, а затым тройчы абводзілі вакол дзяжы: за адзін канец трымаўся маладажон, за другі – сват у маладога, сястра – у маладой)

7. Растлумачце функцыю ручніка-падножніка? (пад час благаслаўлення, вянчання стаяць на ручніку, значыць быць шчаслівым у сямейным жыцці)

8. Куды, дзеля магіі павелічэння сям’і і забеспячэння яе дастатку, павінна была высыпаць нявеста жыта з рукава, прыехаўшы у дом жаніха, пакуль не пераступіла парог ? (на ручнік, разасланы на парозе хаты)

9. Якім чынам ручнік сімвалізаваў яднанне маладых і ўзаконьваў шлюб у прысутнасці ўсяго роду? Падказка: рукі, пераезд, покуць. ( ім абвязвалі рукі маладых падчас вянчання, пераезду ў хату жаніха, накрывалі маладых, калі садзілі на ганаровае месца ў час святочнага застолля)

10.Каго і чым абдорвала нявеста на вяселлі? (ручнікамі; свата, дружкоў, свекра і свякруху, братоў і сясцёр жаніха, радню маладога, музыкаў)

11.Дзеля чаго, на вашу думку, пасля першай ночы, маладая павінна была пакінуць па ручніку ў хляве, гумне, клеці, на вуллях, над калодзежам, над куфрамі? (ручнік у ролі дара-ахвяры, каб задобрыць хатніх і родавых духаў новай сям'і)

12. На стале 5 ручнікоў. Як з дапамогай іх падрыхтавацца да прыезду маладых у хаце жаніха? (1 – на абраз, 2 – на парозе, 3 – пад каравай, 4 – на лаўку для маладых, 5 – пакрыць галовы, калі будуць садзіцца за стол;)

13. На гэта ў адказ маладая дэманструе свае ручнікі. Падлічыце іх колькасць.
(1 – маладая вешае на цвік у знак будучай гаспадыні, 2 – засцілае на стол, 3 – вешае свой абраз, пакрыты ручнікам, 5-11 – выстава яе ручнікоў перад гасцямі, 12 – у канцы вяселля, пасля таго, як сама маладая прыносіла ваду дахаты, каб абмыць рукі бацькам.)

**VI.** III жыццёвы этап, звязаны з ужываннем ручніка, – <u>пахавальна-памінальныя абрады</u>, дзе ручнік – своеасаблівая чарадзейная сцежка ў царства мёртвых.
Як ні дзіўна, але гэты абрад амаль без змен жыве і сёння ў нашай мясцовасці. І я прапаную вам прасачыць яго па ланцужку.

Ручнік – люстэркі і бліскучыя прадметы – цела нябожчыка – труна – левая рука памерлага – труна на могілках – вокны – надмагільны крыж – запрошаныя на памінальную вячэру.

**VII.** Ручнік-абыдзеннік як ахоўны прадмет выкарыстоўваўся ў <u>крызісных жыццёвых сітуацыях</u>. І якія б няшчасці не здараліся, асноўным правілам лічылася наступнае: колькі жанчын адной вёскі збіраліся ў адну хату і за ноч або на працягу дня ад усходу да заходу сонца павінны былі напрасці і выткаць ручнік, у асобных выпадках яшчэ і вышыць. Даўжыня ручніка была розная, як і дзеянні з ручнікам-абыдзеннікам.

**VIII.** Меў месца ручнік і ў <u>каляндарнай звычаёвасці</u> беларусаў, хоць і выкарыстоўваўся значна радзей. Вам прапануецца адгадаць, пра якія святы народнага календара ідзе гаворка.

1. Пачынаем з зімы.ставілі на рацэ ледзяны крыж, упрыгожвалі яго папяровымі кветкамі і вешалі спецыяльна прыгатаваны доўгі ручнік. (Вадохрышча, якім завяршаліся Каляды)

2. Вясна. Абрад "споведзі дзежкі", калі дзяжу мылі, накрывалі новым ручніком, абкурвалі і клалі ў яе вугельчык, але хлеба не расчынялі, бо дзежцы цяжка будзе спавядацца. (Зборава субота – першая субота Вялікага Посту)

3. Лета. У час навальніцы вывешвалі за акно ручнік, якім прыкрывалі нябожчыка, каб уберагчыся ад нячысцікаў. (Ілля)

4. Лета. На дрэвы, што выраслі на месцы разбуранага храма, капліцы ці магіле або дуплаватыя дрэвы ў старых гаях павязвалі ручнікі. (Сёмуха).

5. Лета. Зжынаўся першы сноп жыта, абвязваўся ручніком і ставіўся на покуці. (Зажынкі)

6. Восень. Гаспадыня хаты абвязвала комін ручніком, а моладзь упрыгожвала яго кветкамі. (на Сямёна, "жаніцьба коміна")

7. Восень. Гаспадыня ў еўні (дзе захоўвалі збожжа) рассцілала белы вышываны ручнік і пакідала пачастункі еўніку. (Звіжанне)

**IX.** Адвядзем колькі слоў і часу нашай выстаўцы ручнікоў. У 1 сказ змясціце гісторыю "свайго" ручніка.

**X.** А цяпер пытанне на 10 балаў самаму ўважліваму слухачу. Патлумачце, калі і чаму так гавораць: "РУЧНІКАМІ ШЛЯХ УСЛАНЫ" ?

І ў заключэнні хачу прыгадаць добрую даўнюю традыцыю: дарагім, жаданым гасцям падаюць на ручніку каравай. А дарагія госці таму, што ўшанавалі, ўважылі сваёй прысутнасцю ручнік – сімвал чысціні, талісман і абярог нашага жыцця, і нашы продкі за гэта нам будуць удзячны.